ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

22 кастрычніка 1931 г. № 247 (1515)

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦК І МЕНГАРКОМУ ЛКСМБ

Ячэйка—баец за організацыйна-гаспадарчае умацаваньне колгасу

Правільнай організацыяй працы, разьмеркаваньнем прыбыткаў—мацаваць вытворчасьць колгаснай гаспадаркі

Організацыйна-гаспадарчае мацаваньне колгасаў—цэнтральнае зьвяно

У асноўных збожжавых раёнах колектывізацыя закончана. Больш 10 тыс. колгасаў яднаюць каля 50 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР. Гэтыя колгасы і 329 саўгасаў ператварыліся ў асноўнага вытворца сельска-гаспадарчай сыравіны. БССР шпаркімі крокамі ператвараецца з раёну спажывецкага ў раён буйнай жывёлагадоўлі і тэхнічных культур.

Колгасны рух уступіў у новы этап свайго разьвіцьця. Нельга і памылкова было-б думаць, што галоўная задача зараз—хутчэйшае ўцягненьне ў колгасы рэшты аднаасобнікаў. Зараз, калі асноўная маса сялянства па Саюзе ўступіла ў колгасы, нашай галоўнай задачай зьяўляецца організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, аб чым з усёй яскравасьцю сказана ў пастанове ЦК Усе КП(б) ад 2-га жніўня: „у цэнтры ўсёй работы паставіць організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў у іх цяперашняй арцельнай стадыі разьвіцьця: організацыя працы, пастаноўка справы ўліку, праведзеньне зьдзельшчыны, барацьба за якасьць работы, організацыя высокатаварных колгасных ферм, утварэньня кармоў".

Кулацтва ня здолеўшы ўстрымаць бядняцка-серадняцкія гаспадаркі ад уступленьня ў колгасы, імкнецца зараз падарваць работу ўнутры, пралезшы ў яго. Яно зрывае організацыю працы, агітуе за абязьлічку, супроць зьдзельшчыны за ўраўнілаўку пры разьмеркаваньні ўраджаю і прыбытку, за скарачэньне соцыялістычнага накапленьня ў колгасе. Аб гэтым з усёй яскравасьцю сьведчыць зьмешчаны сёньня матар'ял з колгасаў Плешчаніцкага і Слуцкага раёнаў.

Ня гледзячы на зусім выразныя дырэктывы партыі аб тым, што на даным этапе колгаснага будаўніцтва галоўнай нашай задачай зьяўляецца організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, паасобныя комсамольскія організацыі (Слуцкая, Плешчаніцкая і інш.) не паставілі гэту задачу ў цэнтр увагі. Організацыя працы, разьмеркаваньне прыбытку, узьняцьце таварнасьці, узровень соцыялістычнага накапленьня, падрыхтоўка кадраў і г. д. ня стала яшчэ асноўным стрыжнем работы комсамольскай ячэйкі. Слаба выконваюцца пастановы IX зьезду аб павышэньні ўдзелу ячэек у організацыі працы, каб стаць ініцыятарам плянавай работы ў колгасах (складаньне гадавога і пакварта̀льнага пляну), аб рабоце вытворчых нарад, аб разьмеркаваньні ўраджаю і прыбытку, аб укараненьні соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Недапушчальна марудна выконваюцца дырэктывы зьезду аб організацыі комсамольскай ячэйкі ў кожным колгасе.

Гэты прабел у рабоце комсамольскіх організацый павінен быць тэрмінова ліквідаваны. Трэба па-баявому ўзяцца за організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, як за цэнтральную задачу на даным этапе колгаснага будаўніцтва; шырэй разгарнуць барацьбу за стварэньне новай грамадзкай дысцыпліны працы, прывіцьцё колектыўных звычак у працы, укараніць зьдзельшчыну, улік, дабіць абязьлічку, узьняць таварнасьць і ўзровень соцыялістычнага накапленьня, падрыхтаваць кадры кіраўнікоў соцыялістычнай вытворчасьці з комсамольцаў, лепшых ударнікаў моладзі. Гэта зьяўляецца зараз асноўным зьвяном, ухапіўшыся за яго мы забясьпечым яшчэ больш шпаркі рух наперад.

Пасьпяхова ажыцьцявіць задачу організацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня колгасу мы зможам толькі ў бязьлітаснай барацьбе з кулацтвам, ачышчаючы ад яго колгасы, і барацьбе з правымі опортуністымі, якія ігноруюць організацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне колгасаў, „левымі", якія, у пагоні за 100 проц. колектывізацыяй, забываюцца аб організацыйна-гаспадарчым умацаваньні колгасаў.

Больш клясавай пільнасьці, мацней удар па клясавым ворагу!

Змагаюцца за моцную колгасную вытворчасьць

Колгас „Чырвоны бераг" (Бярэзіўскі раён) організаваўся з 10 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Кулацка-заможная частка вёскі прыклала ўсе сілы, каб разбурыць колгас: страшылі колгасьнікаў праз сваіх агентаў, якія пралезьлі ў колгас, зрывала работу, агітавала супроць зьдзельшчыны, за абязьлічку, псавала сельска-гаспадарчы інвэнтар, падрывае сельска-гаспадарчую вытворчасьць. Але бядняцка-серадняцкая частка згуртаваўшыся пад кіраўніцтвам комсамольскай ячэйкі, павяла рашучую барацьбу з клясавым ворагам. Выкінулі з колгасу падкулачнікаў, павялі рашучае наступленьне на абязьлічку, за ўкараненьне зьдзельшчыны, сваім энтузіязмам у рабоце ўцягнулі астатнія бядняцка-серадняцкія гаспадаркі вёскі. К часу масавай вясеньняй сяўбы колгас налічваў ужо 109 гаспадарак.

У вясновую і ўборачную кампаніі ўсе колгасьнікі былі організаваны ў брыгады па 5-6 чалавек, ліквідавана абязьлічка, да кожнай брыгады прымацавана пэўная колькасьць сельска-гаспадарчага інвэнтара, цягавая сіла, збруя. Зусім зьнікла псаваньне інвэнтара і збруі, коні ў час сяўбы дагледаліся добра, нормы выпрацоўкі перавыконваліся на 10-20 проц.

Уся праца пераведзена на зьдзельшчыну з улікам колькасьці і якасьці працы кожнага колгасьніка. Працадні запісваюцца сыстэматычна кожную пяцідзёнку, як толькі выканана заданьне. Брыгады паміж сабой спаборнічаюць. Шырока разгорнутае спаборніцтва дало магчымасьць выканаць плян вясновай сяўбы раней тэрміну на 5 дзён.

Уборка збожжавых скончана своечасова. Плян асеньняй сяўбы выканан на 3 дні раней тэрміну. Засеяна 230 га. На 50 проц выканан плян зяблівага ворыва.

Па-баявому на аснове зьдзельшчыны праходзіць уборка бульбы. К 24 кастрычніка ўборка будзе скончана.

Праўленьне і комсамольская ячэйка шырока разгарнулі падлік працадзён, якія выпрацаваны колгасьнікамі за гаспадарчы год, з тым, каб к вызначанаму ўрадам тэрміну скончыць разьмеркаваньне колгасных прыбыткаў і ўраджаю. Дырэктыва Колгасцэнтру і Наркомзему аб разьмеркаваньні ўраджаю і прыбыткаў прапрацавана на сходзе колгасьнікаў.

Колгасьнікі шчыра падтрымліваюць прынцып разьмеркаваньня прыбыткаў па колькасьці і якасьці працы як адзін з фактаў гаспадарчага ўмацаваньня колгасаў, барацьбы з кулацтвам і гультаямі.

Добры прыклад у рабоце паказвае колгас „Герой рэволюцыі". На аснове пераводу ўсёй работы на зьдзельшчыну колгас ужо скончыў асеньнюю сяўбу, уборку бульбы і пераключыўся на дапамогу адстаючым у сяўбе суседнім колгасам.

З колгасаў „Чырвоны бераг" і „Герой рэволюцыі" трэба ўзяць прыклад.

Алесь М.



Ударная брыгада на ўборцы гароднівы.

САРВАЦЬ ШЫЛЬДУ

Выгнаць кулакоў з колгасу

У колгасе „Трактарысты" (Крайскі сельсавет, Плешчанскі р-н) пралезьлі кулацка-заможныя элемэнты, якія мелі цьвёрдае заданьне і індывідуальна абкладзены. Такімі зьяўляюцца Валуй Пятрусь, Шкель Сьцяпан, Пцяў Паўлюк, Шкель Язэп Язэпаў, Смольнік Лаўрэн і інш. Пад крыльцам колгасу гэтая група клясава-варожых элемэнтаў зрывае работу. Яна сарвала абагульненьне ўраджаю азімых і яравых пасеваў, абагульненьне таварнай часткі буйнай рагатай жывёлы, правяла кулацкую лінію ў падзеле сена. Колектыўна скошанае сена падзялілі на прынцыпу колькасьці жывёлы, якая знаходзіцца ў індывідуальным карыстаньні. Кулацкая частка, маючы на дзьве-тры каровы, атрымала ў некалькі раз болей бядняцка-серадняцкай гаспадаркі. Прынцып разьмеркаваньня ўраджаю і прыбытку па колькасьці і якасьці выпрацаваных працадзён таксама сазілі не забясьпечыўшы абагулены гурт жывёлы сенам, яны гэтым самым сарвалі падрыхтоўку кармовай базы пад агрвмаджаную частку колгаснай жывёлы.

Кулацкая група накіравала сваю дзейнасьць на зрыў правільнай організацыі працы. Кулакі ня выходзяць на работу, зрываюць укараненьне зьдзельшчыны. Што адбілося на працоўнай дысцыпліне. Адсталая частка колгасьнікаў, сьледам да кулацкаю групай, замест выбіраць колгасную бульбу пазабірала раней абгуленых імі коняй, калёсы і збрую і разышлася па сваіх палосках выбіраць бульбу.

Ня гледзячы на пастанову праўленьня колгасу тэрмінова распачаць зяблівае ворыва, на работу ніхто ня выходзіць.

Крайскі сельсавет і партыйная ячэйка ведаюць аб гэтым, але праяўляюць опортуністычную блізарукасьць, ніякіх мер для ачысткі колгасу ад кулацка-заможных элемэнтаў і мобілізацыі колгасьнікаў на выкананьне дырэктыў партыі аб організацыйна-гаспадарчым умацаваньні колгасаў ня прымаюць. Трэба адзначыць, што і праўленьне колгасу ня ўжыла энэргічных мер каб правесьці ачыстку ад клясава-варожых элемэнтаў, чым дала ім ня руку, дап могшы ўкрыцца ад цьвёрдага заданьня і падарваць колгасную вытворчасьць.

Кулакоў і заможнікаў трэба тэрмінова выгнаць з колгасу, а кіраўніцтва колгасу, якое ня здолела правесьці вытрыманую клясавую лінію ў рабоце,—зьмяніць.

Я. Казлоў.

Дабіць ураўнілаўку

Слуцак. Кіраўніцтва колгасу „Прамень Комуны" не праводзіць у жыцьцё дырэктыў партыі і ўраду аб організацыйна-гаспадарчым умацаваньні колгасаў. Зьдзельшчына праводзіцца формальна, няма ўліку працадзён. Вось прыклад: Брыгадзе Касцоў, якая працавала на аснове зьдзельшчыны і ўвесь час перавыконвала нормы выпрацоўкі, праўленьне запісала працадні адзённа, не далічыўшы 261 працадзён.

Колгас пачаў разьмеркаваньне ўраджаю, з-за таго, што працадні шмат якім колгасьнікам ня ўлічваліся, праўленьне парашыла разьмеркоўваць ураджай не на аснове партыйнага прынцыпу „хто больш і лепш працуе, той больш і тымае, а хто не працуе, той нічога не атрымоўвае", а стала на шлях ураўнілаўкі. Колгасьнікам, якія не выходзілі на працу ці дрэнна працавалі праўленьне парашыла даваць нараўне з тымі колгасьнікамі, якія працавалі сапраўды па-ўдарнаму і выпрацавалі многа працадзён. К прыкладу можна ўзяць Яцэвіча У., які дрэнна адносіўся да працы і выпрацаваў мала працадзён. Праўленьне колгасу парашыла надзяліць яго нараўне з іншымі колгасьнікамі. Гэты мэтод ураўнілаўкі б'е па зьдзельшчыне, садзейнічае росту гультайства, расхлябанасьці і дае сябе адчуваць зараз у час уборкі бульбы і сілосаваньні. Уборка бульбы праходзіць слаба.

Слуцкі райколгассаюз павінен рашуча ўдарыць па тэндэнцыях ураўнілаўкі дабіцца, каб колгас „Прамень комуны" выправіў зараз-жа дапушчаныя скрыўленьні ў разьмеркаваньні прыбытку і ўраджаю.

Брыгадзір „Ч. З."
Янка Прыбытак.

Фашысцкі ўрад Брунінга рыхтуе новы надзвычайны дэкрэт голаду і беспрацоўя

РЭВОЛЮЦЫЙНЫЯ МАСЫ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ КПН, АКАЗВАЮЦЬ ОРГАНІЗАВАНЫ ПРОЛЕТАСКІ АДПОР

Фашысцкі тэрор супроць рабочых

БЭРЛІН. У Браўншвэйгу, дзе ўлада, як вядома, складаецца з фашыстых, адбылася агульна-нямецкі зьлёт штурмовых атрадаў нацыянал-соцыялістых (фашыстых). Кіраўніцтва нямецкіх дзяржаўных чыгунак прадставіла фашыстым 40 спэцыяльных цягнікоў. Фашыстыя, якія пачалі зьяджацца ў Браўншвэйгу, трымаюць сябе выключна нахабна.

Па вуліцах увесь час маршыруюць фашысцкія атрады, якія нападаюць на ўсіх, хто ім здаецца ня надта нацыянальна настроены. За адзін толькі ўчарашні дзень у больніцы Браўншвэйгу было дастаўлена 15 ахвяр фашысцкіх зьдзекаў, у тым ліку—адзін беспартыйны стары рабочы. Учора пасьля абеду фашыстыя організавалі напад на рабочы раён Браўншвэйгу. У адным з вуліц гэтага раёну фашыстыя выбілі амаль усе вокны. Паліцыя ня спыняе гэтых зьдзекаў. Комуністыя організуюць пролетарскую самаабарону. Учора ўвечары паміж рабочымі і фашыстымі адбыліся сур'ёзныя сутычкі. Некалькі фашыстых паранена. Паліцыя ачапіла ўвесь рабочы раён гораду. Соцыял-дэмократычная і рэформісцкая організацыя Браўншвэйгу абмежавалася тым, што зьвярнулася па тэлеграфу да ваеннага міністра ўнутраных спраў Грэнэра з просьбай абмежаваць іх ад фашыстых. Грэнэр адказаў, што ўрад ня мае магчымасьці ўмешвацца ў гэту справу.

„Жорсткія правілы для беспрацоўнай моладзі зьмякчоны"

БЭРЛІН. Як вядома, чэрвеньскі надзвычайны дэкрэт зьнішчыў дапамогу беспрацоўнай моладзі і замужнім беспрацоўным жанчынам. Цяпер аб'яўлена аб некаторым зьмякчэньні гэтага парадку, праўда вельмі ня значным. Лік беспрацоўнае моладзі ўжо перавысіў 700 тысяч чалавек, і зімою дасягне аднаго мільёна. Як прымушан прызнаць „Форвэртс", толькі 150 тысяч чал. беспрацоўнае моладзі будуць атрымліваць дапамогу ў выніку зьмякчэньня чэрвеньскага дэкрэту. Гэта ўступка ўраду пазваляе соцыял-дэмократычнаму друку паведаміць ва ўрачыстых тонах, што для беспрацоўнай моладзі жорсткія правілы дэкрэту зьмякчаны.



Сход протэсту супроць акупацыі Манчжурыі.

„Ажыўленьне" гаспадаркі і новы наступ на пажыцьцёвы ўзровень рабочых—асноўная задача новага дэкрэту

БЭРЛІН 20. Другі ўрад Брунінга лічыць сваёй асноўнаю задачаю „ажыўленьне гаспадаркі". У сувязі з гэтым урад падрыхтоўвае новы надзвычайны дэкрэт. Асноўным прынцыпам гэтага дэкрэту зьяўляецца прадастаўленьне рэйхсбанкам вялікіх крэдытаў нямецкай прамысловасьці. Ва ўрадавых колах лічаць, што прадстаўленьне крэдытаў прамысловасьці дасьць магчымасьць павялічыць колькасьць занятых рабочых на 1 мільён скрацііўшы такім чынам беспрацоўе.

Другім важнейшым мерапрыемствам „ажыцьцяўленьня" гаспадаркі ўрад лічыць новае скарачаньне аплаты рабочым. Прадпрыемствы ўжо папярэдзілі ўрад, што скарачэньне кошту продукцыі магчыма толькі шляхам скарочаньня заработнай платы. У сувязі за зьніжэньнем зарплаты прадбачацца вялікія конфлікты паміж рабочымі і прадпрыемцамі.

У кожным колгасе—комсамольская ячэйка

Весь па к'м трэба трымаць раўненьне

Комсамольская ячэйка колгасу „Расьсьвет“ і Расонская райорганізацыя барацьбу за рост цесна ўвязалі з колгасным будаўніцтвам

Барацьба за комсамольскую ячэйку ў кожным колгасе, саўгасе і МТС—адна з ударных задач у барацьбе за шматмільённы комсамол. Рад ячэек Расонскага раёну дабіўся не малых посьпехаў у выкананьні гэтай задачы. Барацьбу за шматмільённую організацыю ячэйкі гэтага раёну падначалілі задачам колгаснага будаўніцтва.

Аднак, мы яшчэ зусім слаба змагаемся за комсамольскую ячэйку ў кожным колгасе; дрэнна замацоўваем іх, ня прыцягваем навічкоў да практычнай работы ячэйкі.

У гэтым кірунку мы ў бліжэйшы час павінны дабіцца рашаючага пералому. Пры дапамозе сталінскай пуцёўкі мы павінны мобілізаваць вясковую організацыю на выкананьне гаспадарча-політычных задач. Усе комсамольскія організацыі павінны па прыкладу комсамольцаў колгасу „Чырвоны Прымежнік“ неадкладна разгарнуць распрацоўку і ажыцьцяўленьне маршрутаў сталінскай пуцёўкі.

Усё абяцаюць...

Гаяоўчыцкі сельсавет Петрыкаўскага р-ну колектывізаваны на 62 проц. Аднак, у сельсавеце няма ніводнай комсамольскай ячэйкі. Работнікі райкомаў абяцалі організаваць у двух колгасах ячэйкі. Калі-ж нарэшце райком выканае рашэньні IX зьезду УсеЛКСМ аб стварэньні пры кожным колгасе комсамольскай ячэйкі? В.

Пасьля зьмены опортуністычнага кіраўніцтва

Комсамольская ячэйка колгасу „Асьвета“ Любаньскага р-ну ня так даўно налічвала ў сваіх радох толькі 18 комсамольцаў. Па-за комсамолам было больш 150 маладых колгасьнікаў і батрацкай моладзі.

За апошнія месяцы, асвабадзіўшыся ад опортуністычнага кіраўніцтва, ячэйка разгарнула шырокую політвыхаваўчую работу сярод моладзі па ўцягваньню яе ў комсамол.

Праведзены па ўсіх колгасах і вёсках зьлёты моладзі, гутаркі і г. д.

Зараз ячэйка налічвае ў сваіх радох каля 70 чалавек. Акрамя гэтага, організавана колгасная ячэйка з 15 чал.

Барацьба за рост была падпарадкавана задачам пасіленьня тэмпаў уборкі і асеньняй сяўбы. У новай ячэйцы была організавана скразная ўдарная брыгада з комсамольцаў і моладзі. Гэтая брыгада перавыконвала ўсе нормы. Па ўборцы лёну норма на чалавека—0,03 га, а члены брыгады давалі па 0,04 га. Па вязцы снапоў і сяўбе азімых брыгада таксама перавыконвала нормы.

Брыгада ўзяла на соцыялістычны буксір іншыя брыгады колгасу, якія не выпрацоўвалі нормы.

Дрэнна з політвыхаваньнем навічкоў. Ня ўсе навічкі ахоплены політвучобай.

Кіс.

Ня ўтрымаліся на сваіх позыцыях

Ячэйка колгасу „Сьцяг Леніна“ Брагінскага р-ну зусім маладая. Але дзякуючы сваёй упартай барацьбе ў часе ўборачнай кампаніі ячэйка дабілася значнага аўторытэту сярод колгаснай моладзі. Лепшыя ударнікі, маладыя колгасьнікі пашлі ў комсамол. Зараз ячэйка налічвае 25 чал.

Аднак, ячэйка ў час асеньняй сяўбы не змагла ўтрымацца на сваіх позыцыях. Ячэйка не пераключылася своечасова на асеньнюю сяўбу і зблівае ворыва, дык за апошнія месяцы ня вырасла ні на аднаго чалавека. Протчанка.

Райкомаўцаў у вочы ня бачылі

Бабруйскі сельсавет, Жлобінскага р-ну налічвае 7 колгасаў. Аднак організацыя ячэек ЛКСМБ пры кожным колгасе не праводзіцца.

Толькі пры адным колгасе сёлета організавана комсамольская ячэйка. Але і гэтая ячэйка з часу організацыі нікога ня бачыла з райкому комсамолу і апынулася ў тыле ўсіх гаспадарча-політычных кампаній, якія праводзяцца зараз на вёсцы.

Партыйная ячэйка саўгасу „Халіч“ ніякай дапамогі комсамольскай не аказвае.

Жлобінскі РК павінен пакончыць з опортуністычнай недаацэнкай рашэньняў комсамольскіх зьездаў аб стварэньні пры кожным колгасе комсамольскай ячэйкі. Разам з ростам цэмантаваць новаорганізаваныя ячэйкі. Клімянок.

Права на перадышку ніхто ня даў

Да суровай адказнасьці зрыўшчыкаў вайсковай работы і „пачываючых на лаўрах“

У другую палову лістапада ў Маскве адкрываецца ўсесаюзная ваенная нарада. Гэтымі днямі у Менску скончыла сваю работу ўсебеларуская ваенная нарада. Падкрэсьліўшы наяўнасьць зруху у вайсковай рабоце ЛКСМБ нарада вызначыла далейшыя задачы комсамолу у гэтай галіне.

Усё-ж сёньня прыходзіцца падкрэсьліць, што вайсковая работа шмат дзе пастаўлена з рук вон дрэнна. У паасобных організацыях (Менск, Бярэзіна) наступіла поўная перадышка. Райорганізацыі не замацавалі вынікі і зрухі, якія далі манэўры Чырвонай арміі і СПА. Паасобныя героі перадышкі праяўляюць поўную опортуністычную практыку. „Шапкамі закідаем“. „Ва ўсякім выпадку дамо адпор буржуазіі“—вось „лёзунг“ паасобных гора-кіраўнікоў комсамолу і асоавіяхэму.

Комсамольскія ячэйкі і колектывы павінны падтрымаць выклік бабруйскіх комсамольцаў, якія зь вярнуліся з лістом да ўсёй комсамольскай організацыі саюзу аб падрыхтоўцы добраякасных стралкоў комсамольцаў для нашай краіны.

Умацуем жалезны фонд абароны

Комсамольскія зьезды, якія адбыліся ў пачатку 1931 г., моцна запісалі аб неабходнасьці ўзмацніць вайсковую работу і ў прыватнасьці шэфства над морскім і паветраным флётам.

З гэтай мэтай цэнтральным домам комсамолу выпушчаны адкрыткі з жыцьця і работы нашых флётаў.

Хутка гэтыя адкрыткі прыбудуць к нам у БССР. Комсамольскія організацыі павінны безадкладна разгарнуць масавую работу па распаўсюджваньню гэтых адкрытак сярод комсамольцаў і ўсіх працоўных.

Заданьне ЦК ЛКСМБ па распаўсюджваньню адкрытак павінна быць ня толькі выканана, але і недавыканана.

Рэалізацыяй гэтых танных адкрытак (10 кап. штука) мы ўзмацнім матар'яльную дапамогу нашым падшэфным.



Комсамольцы „Бальшавіка“ вы здорава адстаеце

У час сьвяткаваньня 17 МЮДу комсамольскі колектыў абутковай фабрыкі заключыў соцумову з комсамольскім колектывам заводу „Бальшавік“ на лепшую вайсковую падрыхтоўку. Зараз можам падвесьці вынікі гэтага дагавору па абутковай фабрыцы.

Вайсковы пункт наведваюць усе 100 проц. комсамольцаў і вялікая колькасьць рабочай моладзі. Добра працуе сангуртоК, гурток сувязі, апошні атрымаў у час манэўраў прэмію Зараз на фабрыцы організавана яшчэ адна санкаманда. Гэтая каманда выклікала на соцспаборніцтва каманды заводу „Бальшавік“ і фабрыкі „Акцябр“.

Комсамольцы заводу „Бальшавік“ зусім слаба выконваюць дагавор на соцспаборніцтва.

ЛЕЎ

„А воз і зараз там...“

Колькі раз гаварылі аб вайсковай рабоце на бюро і пленуме Барнянскага камітэту ЛКСМБ.

Аднак, па сёньня ніводная ячэйка не займаецца вайсковай вучобай. Райком нічым, акрамя сухіх дырэктыў, не дапамагае. Не адстае ад райкому комсамолу і райсавет Асоавіяхэму. Ня дзіва, што большасьць ячэек АСО развалілася.

Галіна

„Ва усякім выпадку адпор буржуазіі дамо“

На заводзе „Зьвязда“ (Капцэвічы) не вядзецца вайсковая работа. Ужо больш году, як ня было вайсковых занаткаў. Сакратар ячэйкі Асоавіяхэму тав. Цвірко кажа:—„Мы ва ўсякім выпадку адпор буржуазіі дамо“. Комсамольскі колектыў правярацъ вайсковыя веды комсамольцаў яшчэ не пачынаў. Колектыў усё чакае дырэктыў ад райкому.

Ніякай работы комсамольскі колектыў не правёў і па прызыву 1909 году. Комсамольцы ніякай работы з прызыўнікамі (30 чал.) не правялі.

Петрыкаўскі РК КСМ павінен неадкладна заняцца гэтай ячэйкай і прыняць адпаведныя меры, аб якіх сказана ў рашэньнях IX зьезду УсеЛКСМ.

Зубасты Грышка

Сэкратар адмаўляецца ад ваеннай работы

У комсамольскай ячэйцы колгасу „Перамога“ Пухавіцкага р-ну вайсковая работа ў загоне Сэкратар ячэйкі, ня гледзячы на рад прапаноў комсамольцаў, адмаўляецца організаваць вайсковы гурток.

Ня лепш справа і ў іншых ячэйках Пухавіцкага раёну. Райком комсамолу не дае ячэйкам ніякіх указаньняў у галіне вайсковай работы.

К.



Расьлі за лік лепшых ударнікаў...

Комсамольская організацыя Расонскага раёну ў барацьбе за шматмільённы комсамол дабілася значных посьпехаў. Калі на 1-е сакавіка ў організацыі налічвалася 134 чал., дык на 1-е кастрычніка каля 600.

Рад ячэек паказалі сапраўдную работу ў барацьбе за рост. Так, на прыклад, Сакалішчанская вырасла з 11 да 74 чал. і організавала адну колгасную ячэйку з 18.

Гэта-ж ячэйка за час вясеньняўборачнай кампаніі організавала тры колгасы.

Гарбачоўская ячэйка вырасла з 17 чал. да 54. Дзяржацкая—з 22 да 61 чал. Юхавіцкая—з 14 да 36 чал. і організавала адну колгасную ячэйку з 19 комсамольцаў. Гэтай-жа ячэйкай была організавана два новыя колгасы. За час вясеньняпасеўнай і ўборачнай кампаніі Юхавіцкая я-ка ўцягнула ў старыя колгасы 34 бядняцка-серадняцкія гаспадаркі.

Гэтыя ячэйкі расьлі выключна за лік лепшых ударнікаў колгасных палёў. П.

У каго варта павучыцца

Комсамольская ячэйка колгасу „Чырвоны франтавік“ (Стара-Дарожскага р-ну) зусім нядаўна організавалася. Ячэйка адразу пераключылася на практычную работу. Дзякуючы ўдарнай рабоце, комсамольцы насілосавалі 16 тыс. пудоў корму. Колгас скончыў здачу хлеба і прыступіў да апрацоўкі і здачы лёну.

Гаспадарча-політычныя кампаніі ўвязваюцца і з вучобай ячэйкі. Політгурткі працуюць два разы на тыдзень, а ваенны гурток адзін раз. Заняткі праходзяць пры 100 проц. удзеле комсамольцаў і вялікай колькасьці беспартыйнай колгаснай моладзі. Даўгучыц.

Пуцёўка ў руках навічкоў

(Ад спэцыяльнага корэспондэнта „Чырвонай зьмены“)

Комсамольская сталінская пуцёўка для комсамольцаў-навічкоў—гэта магутны сродак для таго, каб узьняць іх ініцыятыву, самадзейнасьць, замацаваць у комсамоле і ўключыць у барацьбу за вырашэньне гаспадарча-політычных задач. Гэта асабліва характэрна выявілася на сходзе Вільчанскай ячэйкі (Жыткавіцкі р-н) у той час, калі комсамольцы абгаварвалі маршруты сталінскай пуцёўкі.

Вільчанская колгасная ячэйка організавалася толькі тры месяцы таму назад. Да апошняга часу ячэйка зусім не адчувалася ў жыцьці колгасу „Чырвоны прымежнік“. Ніводнае пытаньне гаспадарчага жыцьця не знаходзіла ў ячэйцы патрэбнага вырашэньня. Узросшая політычная актыўнасьць колгаснай моладзі, яе праца ў колгасе не замацоўвалася ячэйкай.

Створаная напярэдні 17 МЮД'у ячэйка ня вышла ў бой за шматмільённы комсамол. Пасьля МЮД'у ячэйка ня вырасла ні на аднаго чалавека. Ніякае сыстэматычнае работы па росту не вялося. З 14 комсамольцаў толькі некалькі працавалі ў колгасе па-ўдарнаму, як перадавыя колгасьнікі і ў той-жа час ня ведалі, не ўяўлялі, што такое „ударнік“, „соцыялістычнае спаборніцтва“. Партыйцаў у вёсцы няма. Ня было і належнай растлумачальнай работы пра гэтыя важнейшыя мэтоды колгаснае працы.

Сталінская пуцёўка мяняе твар ячэйкі

Падрабязнае азнаямленьне з маршрутамі сталінскай пуцёўкі зьмяніла твар ячэйкі. Ячэйка стала на шлях перабудовы сваёй работы тварам да колгаснага будаўніцтва.

Ячэйка яшчэ ня ведала такога жывога, новага па зьместу, сходу, якім быў сход, прысьвечаны рэалізацыі маршрутаў пуцёўкі.

Пасьля дакладу ўдзельнікі сходу пачалі ўпікаць адзін аднаго за дрэнную работу ў колгасе. На сходзе разгарнулася бальшавіцкая самакрытыка, за ўсім удзельнае вагі ячэйкі ў колгасе.

„Дык я-ж, значыцца, і ёсьць ударнік“

Член бюро ячэйкі Канапацкі Іван выступаючы ў спрэчках, упарта даводзіў немэтазгоднасьць абвяшчаць сябе ўдарнікам. Аднак, калі было растлумачана значэньне ўдарніцтва і соцспаборніцтва, ён заявіў.

—Дык я-ж. значыцца, і ёсьць ударнік.

Гэты таварыш, як і некалькі іншых, працавалі па-ўдарнаму, ня ведаючы пра ўдарніцкі рух і задачы комсамолу ў колгасным будаўніцтве. Гэтыя задачы акрэсьліла вельмі выразна выпукліла перад кожным удзельнікам сходу сталінская комсамольская пуцёўка. Канапацкі Іван абвясьціў сябе ўдарнікам і даў слова ячэйцы працаваць „яшчэ“ больш ударна.

Кожны комсамолец, што прысутнічаў на сходзе, уставаў з месца абвяшчаў сябе ўдарнікам і выклікаў свайго таварыша на соцыялістычнае спаборніцтва. У работу сходу былі ўцягнуты і беспартыйныя. Усе прысутныя тут беспартыйныя маладыя колгасьнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі, узяўшы на сябе цэлы рад абавязкаў.

Па прапанове аднаго колгасьніка комсамальца ўся ячэйка была абвешчана ўдарнай. Ячэйка выклікала на соцспаборніцтва ў лепшай рэалізацыі маршрутаў пуцёўкі Браніслаўскую ячэйку. Арбітрам абралі РК ЛКСМБ і рэдакцыю «Чырвонай Зьмены».

Сталінская пуцёўка—пуцёўка ў жыцьцё

Абавязкі, якія ўзялі на сябе ўдарнікі—комсамольцы, надзвычайна разнастайныя. Так, напрыклад Шчур Трахім абавязаўся ўтрымліваць кароўнік у гігіенічным стане і выклікаў на соцспаборніцтва Кулакевіча Прахора, к б той: „менш спаў і раней выганяў кароў“. Кулакевіч Прахор, прымаючы выклік, узяў новыя абавязкі і выклікаў новых таварышоў. Настаўнік—комсамолец Жулега абавязаўся на 5-му маршруту да першага мая 32 г. ператварыць Вільчу ў вёску суцэльнай пісьменнасьці.

Абавязацельствы конкрэтныя былі ўзяты па ўсіх маршрутах пуцёўкі, па ўсіх галінах работы ячэйкі (барацьба за зьдзельшчыну, вайсковая работа, політвучоба, праца ў яслях і г. д.)

Вільчанская ячэйка, першая ў раёне і Беларусі (12-га) абгаварыўшы сталінскую пуцёўку, стала на шлях вырашэньня гаспадарча-політычных задач. Калі некаторыя абавязацельствы ячэйкі перад сталінскай пуцёўкай часам і ня зусім поўныя, ня зусім баявыя,—дык ва ўсякім выпадку, яны рашуча ўзьнімаюць баяздольнасьць гэтае ячэйкі, навічкоў-комсамольцаў, карэнным чынам мяняюць твар ячэйкі, надаюць ёй большы аўтарытэт у вачох колгасьнікаў.

Бюро ячэйкі і РК ЛКСМБ павінны забясьпечыць жывое, опэрацыйнае кіраўніцтва комсамольцамі, якія так нядаўна прышлі ў комсамол і так заўзята ўзяліся за работу. Бязумоўна, энтузіязм, ініцыятыва гэтых комсамольцаў у процэсе рэалізацыі маршрутаў сталінскай пуцёўкі будзе няўхільна падвышацца, даючы патрэбныя вынікі.

Сталінская пуцёўка, такім чынам, паказвае, як комсамольцы-навічкі, дужа часта політняпісьменныя, усьведамляюць сваё месца ў комсамоле і сваю ролю ў разгорнутым соцыялістычным будаўніцтве. Сталінская пуцёўка для комсамольцаў-навічкоў, для маладых ячэек—пуцёўка ў жыцьцё, яе трэба як мага хутчэй уручыць ім.

Міх. Вярнікоўскі

Жыткавічы, 19 кастрычніка

Комсамол—на штурм бездарожжа

УСЕБЕЛАРУСКІ СУБОТНІК ПАЧАЎСЯ

ВЫТРЫМАЦЬ ЭКЗАМЕН БАРАЦЬБЫ З БЕЗДАРОЖЖАМ!

20-га кастрычніка пачаўся ўсебеларускі суботнік па барацьбе з бездарожжам. Сёньнешнія матар'ялы сьведчаць аб прарывах у падрыхтоўцы і правядзеньні гэтага суботніка

Асноўныя недахопы усё тыя-ж: няўмелая організацыя мас, дрэнная расстаноўка і нерацыянальнае скарыстаньне рабочай сілы ў працэсе працы і інш.

Задача комсамольскіх організацый у час правядзеньня суботніка забясьпечыць стопроцантны выхад на працу ўсіх працаздольных, падрыхтаваць неабходныя матар'ялы і інструманты, мобілізаваць інструмант ня толькі з дысцанцый і вучасткаў, але і той, што знаходзіцца у колгасьнікаў і аднаасобнікаў, правільна і рацыянальна расставіць усіх рабочых на месцы працы, устанавіць людзей, якія-б давалі тэхнічныя указаньні ў процэсе працы.

Усебеларускі суботнік—правесьці па-ўдарнаму

Заданьне выканалі з гонарам

Па ініцыятыве школьнай ячэйкі ЛКСМБ Дубровенскай сямігодкі, вучні адпрацавалі на дарбудаўніцтве 95 працадзён. Працавалі два дні. У суботнік вучні выходзілі на працу ўсе як адзін, без спазьненьня і дэзэртырства.

Працавалі ўдарна. Дадзенае заданьне з гонарам выканалі.

Абінзон ...яма

Прарыў не паслужыў урокам

Жыткавіцкая комсамолія павінна мобілізавацца на поўнае выкананьне плянаў

Плян дарожнага будаўніцтва па Жыткавіцкім раёне выканан толькі на 38 проц. Раённыя і сельсавецкія організацыі не мобілізавалі масы працоўных і комсамольцаў на пасьпяховае правядзеньне месячніку штурму дарожнага будаўніцтва. Сельсавет бязуважны да задач барацьбы з бездарожжам. Напрыклад, Людзяневіцкі сельсавет ні на прэзыдыуме, ні на пленуме, ні на сходах ня ставіць пытаньняў дарпляну.

У выніку нядбайных адносін, дарбудаўніцтва ў Людзяневіцкім сельсавеце зрываецца. Колгасьнікі яшчэ ня выходзілі на працу. Далёка на ўсе аднаасобнікі выканалі сваю працгужпавіннасьць.

Комсамолія Жыткавіцкага раёну, ня гледзячы на рад катэгарычных дырэктыў ЦК ЛКСМБ практычна нічога яшчэ не зрабіла па дарбудаўніцтву. Райком ЛКСМБ абмяжаваўся цыркулярамі, выкананьня якіх ні разу не праверыў не паштурхоўваў ячэйкі.

Жыткавіцкая ...-савецкая, Бранісдаўская, Вільчанская і інш. ячэйкі, ня гледзячы на страшэннае бездарожжа ў гэтых пунктах, опортуністычна бязьдзейнічаюць, не праявілі ініцыятыву ў барацьбе з бездарожжам, ня выканалі дырэктыў РК.

Дарінспэктар неаднакраць зьвяртаўся ў РК ЛКСМБ за дапамогай, сам прапанаваў преміяльны фонд для комсамольскіх ячэек і інш., аднак, дапамогі не дабіўся.

Толькі 18 кастрычніка РК уздумаў склікаць нараду комсамольцаў па дарожнаму будаўніцтву, але нарада сарвалася з-за непадрыхтаванасьці,—прыйшоў толькі адзін комсамолец, замест 10-15.

Мы патрабуем ад РК ЛКСМБ неадкладна ўзмацніць барацьбу з бездарожжам. Вінаватыя ў зрыве дарбудаўніцтва павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

Сэзон канчаецца. РК ЛКСМБ павінен неадкладна павесьці ўсю комсамолію раёну на штурм бездарожжа, на ўсебеларускі суботнік па дарбудаўніцтву.

Лейхтман і М. Вярнікоўскі

Абвяшчаем сябе ўдарнай брыгадай

Комсамол Смалявіцкага раёну абвясьціў сябе ўдарнай брыгадай па ліквідацыі прарыву ў дарожным будаўніцтве.

Вітаючы пастанову ЦК ЛКСМБ, Смалявіцкі Райком комсамолу выпрацаваў рад конкрэтных мерапрыемстваў і ўказаньняў па барацьбе з бездарожжам. Створаны раённы штаб для правядзеньня суботніка. Штаб распрацаваў конкрэтны плян, разьбіў комсамольскія ячэйкі на брыгады і вылучыў адказных кіраўнікоў.

Зараз кожная ячэйка ведае колькі дзён трэба адпрацаваць, як конкрэтна прыступіць да працы на самых вучастках. Уся падрыхтоўка да ўсераённага суботніка праводзіцца ў цеснай сувязі з РК КП(б)Б, РВК, райпрофсаветам і іншымі організацыямі.

Смалявіцкі РК комсамолу выклікае Лагойскі комсамол пасьледваць яго прыкладу.

Навасельскі.

„Откровение“ тав. Себасевіча

У Сенненскім раёне, дзе паводкі асабліва вільна займацца дарожным будаўніцтвам, на сёньня выяўнасьці прарыў.

За ўвесь час РВК не заслухаў справаздачы дарінспэктара і не пастанавіўся вылучыць члена РВК адказным за дарожныя справы ў раёне. Нават партыйныя, савецкія і інш організацыі наказваліся організаваць у раёне ячэйкі Аўтодора. Ня дзіва, што плян па дарожнаму будаўніцтву выканан толькі на 45 проц.

У раёне і па сёньня не організаваны яшчэ месячнік штурму прарыву ў дарожным будаўніцтве.

„Та і дарогі будзем будаваць, калі, будзець аўтомобілі“,—адказаў старшыня РВК Себасевіч.

Партыйныя, комсамольскія, савецкія і профсаюзныя організацыі Сенненшчыны павінны пакласьці канец правоопортуністычным адносінам да будаўніцтва і рамонту дарог. У месячнік штурму—нагнаць прапушчанае.

Зацікаўлены.



„Ахвяра“ бездарожжа на лячэньні.

Безадкладна выйсьці на суботнік

КРАСНАПОЛЬЛЕ. 19—X. (Па тэлеграфу ад нашага спэцкора). Комсамольская організацыя Краснапольскага раёну яшчэ ня ўключылася ва ўсебеларускі комсамольскі суботнік па барацьбе з бездарожжам. РК ЛКСМБ не мобілізаваў увагу комсамольскіх ячэек навакол правядзеньня суботніка. У гэтай справе Краснапольская організацыя ганебна плянецца ў хвасьце.

Каганская.

Райколгасьюз зрывае барацьбу з бездарожжам

За ўвесь час дарожнага будаўніцтва ў Смалявіцкім раёне ніводная колгасная падвода і пешы не працавалі на дарозе.

Райколгассаюз тлумачыць, што колгасьнікі перагружаны сваімі работамі, таму ён не дае дырэктыў колгасам выходзіць на працу.

Такая практыка Смалявіцкага райколгассаюзу павінна атрымаць рашучы адпор. Колгасцэнтр павінен даць катэгорычныя ўказаньні Смалявіцкаму райколгассаюзу аб пасылцы на дарогу рабсілы.

В.

Тэхнічны карантын у дзеяньні

Выязная рэдакцыі „Чырвонай зьмены“ на Гомельскім дрэваапрацоўчым

1-ы і 2-гі дзень тэхкарантыну

У абвешчаны па комбінату дзень карантыну адбыліся першыя заняткі. Карантын праходзілі рабочыя першага калёснага і механічнага цэхаў, па спэцыяльна складзенаму сьпісу, куды ўнесены рабочыя ніжэйшай кваліфікацыі, якія працуюць на варштатах і ўсе падсобныя рабочыя цэху.

Рабочыя комбінату віталі пачын „Чырвонай зьмены“ аб правядзеньні тэхкарантыну, як аднэй з лепшых форм выкананьня сталінскага лёзунгу змагацца за аўладаньне тэхнікай. Рабочыя з вялікаю ахвотай наведваюць заняткі карантыну. Імкненьне стаць тэхнічна-ўзброеным барацьбітом за пяцігодку ў чатыры гады набыло масавы характар, знач на павысіўшы зацікаўленасьць рабочых варштатамі, на якіх яны працуюць.

Дзейную ролю правядзеньні тэхнічнага карантыну і консультацыі прымаюць спэцыялістыя комбінату. Другая тэхнічная нарада выпрацавала дэталёвую програму карантыну для дрэваапрацоўчага і першакалёснага цэхоў, і асобна для механічнага цэху. На нарадзе ў парадку самамобілізацыі галоўны інжынэр комбінату т. Бромберг узяў на сябе абавязак загадчыка навучальнай часткай тэхкарантыну. Праводзіцца масавая праца.

У кожным цэху організаваны комсамольскія пасты, якія праводзяць штодзённую працу, зьвязаную з тэхкарантынам. Асабліва ўзорную працу паказала комсамольская ячэйка ФЗВ комбінату. Па ўсіх цэхах і ў сталовай разьвешаны лёзунгі—агітары за тэхнічны карантын.

На другі дзень былі праведзены заняткі дрэваапрацоўчага і першага калёснага цэху. На занятках прапрацаваны асновы тэхнолёгіі дрэва, зьвязанай з процэсамі працы даных цэхаў.

Праца сталовай не прыстасавана адпаведна, для мэт тэхнічнага карантыну. Назіраюцца выпадкі спазьненьня рабочых на заняткі.

Чарговая задача дрэваапрацоўчага комбінату ў правядзеньні тэхкарантыну — скарыстаць праведзены вопыт, каб дэталёва выпрацаваць сыстэму і програмы праходжаньня карантыну новымі рабочымі, якія прыбываюць на комбінат.

Шапіра.

Гаспадарча-разрахунковай сталоўкай змагацца за ПАЛЕПШАНЬНЕ ГРАМАДЗКАГА ХАРЧАВАНЬНЯ

Комсамольскія організацыі павінны неадкладна ўключыцца ў рэалізацыю шостага маршруту комсамольскай сталінскай пуцёўкі

Прыклады, як трэба працаваць

З мэтай палепшыць грамадзкае харчаваньне, існуючыя 7 сталовак, з буфэтамі і пры іх, выдзелены ў асобную адзінку з агульнай сеткі Менскага ТПО. Організацыйная перабудова самога апарату яя была пасьлядоўнай у далейшым палепшаньні грамадзкага харчаваньня адпаведна з апошнім пастановамі партыі і ўраду.

Асноўнае і рашаючае зьвяно паляпшэньня працы сталовак і якасьці грамадзкага харчаваньня, яскрава вызначанае ў пастанове ЦК і СНК БССР, выпала з работы праўленьня аддзелу грамадзкага харчаваньня і ў прыватнасьці кожнай сталоўкі.

Да гэтага часу ні адна з 7-мі сталовак не пераведзена на гаспадарчы разрахунак, ня выяўлена нават эканомічная мэтазгоднасьць іх існаваньня, не ўстаноўлена норма скідкі на абеды. Усё гэта сьведчыць аб незацікаўленасьці праўленьня аддзелу харчаваньня працай сваіх прадпрыемстваў сталовак. Пытаньне сабекошту—па-за ўвагаю работнікаў праўленьня: яны ня ведаюць аб памеры страт аб іх прычынах.

Таксаваньне абедаў як па аддзелу цалкам, так і па сталоўках не праводзіцца. Няплянавасьць і адсутнасьць вучоту ў працы сталовак, прывялі да таго, што за ліпень месяц 4-м сталоўкам недавыдана продуктаў на 2240 руб., тады як па асобных продуктах ёсьць перавыдача: мяса 98 кгл., хлеба 611 клг., мукі пшанічнай 95 клг. Апрача таго, першая страва адпускалася ў большай колькасьці, чым гэта вызначана па раскладцы, а другая страва—у меншай.

Такога роду комбінацыя практыкуецца ў той час, як продукты выдаткоўваюцца па нормах, а некаторыя нават з перавышкай.

Пастаноўка вучоту па аддзелу грамадзкага харчаваньня ў продуктовых кладовых не на сваім месцы. Штодзённыя зьвесткі аб водпуску продуктаў падаюцца ў канцы месяцу (сталовая № 2 і 6).

Бясплянавасьць і адсутнасьць вучоту ў аддзеле грамадзкага харчаваньня значна адбіваецца на стане працы паасобных сталовых, якімі, між іншым, праўленьне кіруе ад выпадку да выпадку. Два спэцыяльныя інструктары не дапамагаюць у працы загадчыкам сталовак (2,4,6).

У сталоўцы № 6 („Полымя рэволюцыі“). У выніку халатнасьці адміністрацыі недавыдаецца да другой стравы гарнір. Побач з гэтым прадукты, якія павінны ўвайсьці ў папярэднюю раскладку меню, застаюцца ляжаць доўгі час на кухні. Склеп пры сталоўцы працякае і ў ім нельга хаваць продукты. Праўленьне ня прыняла ніякіх захадаў. Наогул партыйныя організацыі і заўком практычна не дапамагаюць у працы загадчыку-вылучэнцу.

У некаторых сталоўках ухітраюцца не давадаць нормы патрэбных на абед продуктаў. Прыкладна, у сталоўцы № 4 за 8-IX не дадана: сьмятаны 14 літраў: масла 3 клг., цукру 1,5 клг. яек 300 і г. д.

Усё гэта павінна быць улічана. У бліжэйшы час неабходна зрабіць практычныя крокі ў галіне перабудовы ўсёй працы аддзелу грамадзкага харчаваньня.

М. Плашчынскі.

Даўно-б час узяць кантроль над меню

(Аб плякатах і грамадзкім харчаваньні ў Воршы)

На беразе ракі Дняпро раскінуўся даволі прыгожы горад Ворша. На цэнтральнай вуліцы гэтага гораду знаходзіцца, як і ў іншых гарадох, сталоўка. Перад уваходам у гэтую сталоўку рэжа вока вялікая, у тры мэтра даўжынёю, шыльда:

ХАРЧЭЎНЯ

Шыльда настойліва даводзіць, што тут сапраўды харчэўня. Але аршанскія жыхары з ня меншай настойлівасьцю і ўпартасьцю сьцьвярджаюць што гэта зусім не харчэўня.

І сапраўды. У Воршы гэта не харчэўня, а іронія над харчэўняй. Тут зусім запамяталі аб якасьці абедаў. Штодня—дзьве аднолькавыя, стандартныя стравы. На першае—боршч з капусты і вады, на другое—капуста без вады, І так штодня.

— Што ўчора, тое і сёньня,—скрабуць патыліцы аршанцы.

— Боты, — кажуць яны, — у нас шыюць па нумарох, а вось абеды ўсё яшчэ стандартныя.

І што яшчэ горш, гэта —антысанітарны стан сталоўкі Уваходзіш у харчэўню, у вочы лезуць плякаты:

Вводи в организм горячую пищу и разные закуски

Не плюйте на пол

Просят перед едой мыть руки

Просят о скатерти руки не вытирать

А паглядзіш, дык ні плявальніц, ні вады для мыцьця рук, ні абрусоў.

Нажы, відэльцы? Хочаш атрымаць нож ці відку?—гані два рублі закладу.

Затое бруд у аршанскай харчэўні ўволю. Сталы і вокны ня мытыя, не завешаныя, афіцыянткі без сарвэтак, надта недалікатныя. Не бяруць, а вырываюць з рук талёны.

А комсамол што робіць?—запытаецеся вы.—Ёсьць-жа шосты маршрут сталінскай комсамольскай пуцёўкі, які абавязвае комсамольцаў змагацца за соцыялістычны быт, за чыстую сталоўку, за добраякасны абед?

Аршанскі комсамол выкрэсьліў з пляну сваёй работы культурна-бытавыя пытаньні, Абыйшлі міма ўказаньне Сталіна аб палепшаньні бытавых умоў рабочых міма шостага маршруту сталінскай комсамольскай пуцёўкі.

А час, даўно-б час Аршанскай комсамольскай організацыі ўзяць кантроль над меню, над санмінімумам, над палепшаньнем культурна-бытавога абслугоўваньня рабочага.

Р. Фялкін.

Зьнішчыць бясплянавасьць

Пастанова ЦК КП(б)Б і СНК БССР аб мерапрыемствах па палепшаньню грамадзкага харчаваньня не знайшла практычнага праламленьня на шклозаводзе „Кастрычнік“ (Асіповічы). Большасьць працаўнікоў рабкоопу і сталовак ня ведае нават аб гэтай пастанове.

Таму не выпадковы факты бясплянавасьці. Сталовая ня ведае колькі трэба загатаваць абедаў, каб задаволіць усіх рабочых. Значная частка рабочых, асабліва вячэрняй і начной зьмены з-за бясплянавасьці ў рабоце адміністрацыі сталоўкі застаецца без абеду.

Абслугоўваючы пэрсонал сталоўкі не зацікаўлены ў палепшаньні якасьці абедаў, дагэтуль не практыкуе міжсобку соцспаборніцтва на лепшае абслугоўваньне рабочых, паменшаньне страт і інш.

Комсамольскі колектыў не рэагуе на факты дрэннай працы сталоўкі і ня ўключыўся ў барацьбу за ажыцьцяўленьне пастановы ЦК КП(б)Б і СНК БССР і 6-га маршруту комсамольскай сталінскай пуцёўкі.

Брыгада „ЧЗ“ Кузьменка, Семянцоў.

Уключайцеся ва ўсесаюзнае спаборніцтва за „тону-апарос", за організаваную сустрэчу зімы

Штаб па сьвінагадоўлі, створаны пры рэдакцыях газэт „Комсамольская праўда" і „Чырвоная Зьмена" прыступіў да працы.

* * *

Барацьба за разгортваньне соцыялістычнай сьвінагадоўлі і ўся работа штабу павінна праходзіць пад цэнтральным лёзунгам высунутым сьвінасаўгасам імя „Комсомольской правды"—„тона мяса з аднога апаросу ў шасьцімесячным узросьце", пад лёзунгам хутчэйшага ўкараненьня гэтай ініцыятывы ва ўсе колгасы і саўгасы Саюзу.

Да ўдзелу у працы штабу прыцягнуць лепшыя навуковыя сілы, партыйна-комсамольскую і савецкую грамадзкасьць.

Разгарнуць шырокую масавую работу па барацьбе за організаваную сустрэчу зімы. У цэнтры сваёй увагі на бліжэйшы час паставіць пытаньне падрыхтоўкі сьвіного гурту да зімы, своечасовае скончэньне будаўніцтва сьвінарнікаў, у асаблівасьці для апаросаў і маладняка і ацяпленьне сьвінарнікаў.

Каб хутчэй і па-ўдарнаму ажыцьцявіць гэтыя задачы абвясьціць штурмавы дэкаднік па падрыхтоўцы да зімы. Тэрмін правядзеньня дэкадніка ўстанавіць дадаткова.

Пытаньні падрыхтоўкі матак да злучкой кампаніі, правядзеньне яе, падрыхтоўка гурту да зімовага апаросу, загатоўка кармоў для супаросных і падсосных матак (сенабабовых расьлін, кармоў жывёльнага паходжаньня), загатоўка падсьцілу, догляд маладняка, загатоўка кармовай базы, неабходнай для пасьпяховага ажыцьцяўленьня лёзунгу атрыманьня тоны-апаросу у шэсьць месяцаў (вітамінныя кармы, бялковыя, концэнтраваныя, мінэральныя)—павінны зьявіцца конкрэтнай праграмай работы кожнай комсамольскай ячэйкі сьвінаводчых саўгасаў, колгасаў.

* * *

Штаб узяў на сябе ініцыятыву популярызаваць інструкцыю НКЗ СССР аб вырошчваньні маладняка ў зімовы час і абавязаўся распрацаваць яе ў кожным сьвінасаўгасе і колгаснай таварнай фэрме, а таксама распрацаваць спэцыяльную тэхнічную інструкцыю у разрэзе ажыцьцяўленьня высунутых задач па барацьбе за „тону апарос" у шэсьць месяцаў.

Каб праверыць падрыхтаванасьць сьвінасаўгасаў і колгасных таварных фэрм і да сустрэчы зімы, 22 кастрычніка на штабе будуць заслуханы даклады чатырох сьвінагадоўчых саўгасаў (Вішнёўка, Сталіна, „Першага Мая". Веленъ) і аднэй колгаснай фэрмы і су[д]аклады сэкратароў комсамольскіх ячэек.

З 20 кастрычніка па 1-е лістапада штаб парашыў правесьці дэкаднік масавых рэйдаў ударных юнкораўскіх брыгад газэт „Комсамольская праўда" і „Чырвоная Зьмена" па пытаньню праверкі падрыхтаванасьці сьвінасаўгасаў і колгасаў да зімы і ажыцьцяўленьня лёзунгу „тона апарос".

Штаб лічыць неабходным правесьці ўсесаюзную радые-пераклічку па пытаньнях абмену вопытам работы сьвінасаўгасаў, падрыхтоўкі да сустрэчы зімы і практычнага ажыцьцяўленьня лёзунгу „тона-апарос". З 20 кастрычніка штаб абвяшчае збор рабочых прапаноў на лепшую падрыхтоўку да сустрэчы зімы, догляду матак, апаросу і ажыцьцяўленьня лёзунгу высунутага сьвінасаўгасам „Комсомольская правда" (Аршанскі раён).

З 1-га па 1[0] лістапада штаб праводзіць усебеларускую пераклічку 15-ці сьвінагадоўчых саўгасаў і комсамольскіх ячэек для абмену вопытам работы па рэалізацыі пастаноў ЦК УсеКП(б), ЦК КП(б)Б і СНК аб разгортваньні соцыялістычнай жывёлагадоўлі. На пераклічку саўгасы і комсамольскія ячэйкі расскажуць як яны падрыхтаваліся да зімы, як ідзе будаўніцтва сьвінарнікаў, як з ацяпленьнем, укомплектаваньне гурту, загатоўка кармоў. Ячэйкі КСМ расскажуць як яны ўвязваюць барацьбу за шматмільённы комсамол з выкананьнем вытворчых плянаў і гаспадарча-палітычных кампаній.

Купаньне заводскага храка „Кэрзон"

Усесаюзны штаб па сьвінагадоўлі праводзіць шырокую работу па ажыцьцяўленьню шэфства заводаў над сьвінагадоўлямі і колгаснымі таварнымі фэрмамі, каб перанесьці соцыялістычныя мэтады працы з заводу ў саўгас, колгас і аказаць соцыялістычную ўзаемадапамогу. Каб хутчэй ажыцьцявіць шэфства і організаваць працу ў саўгасе і колгасе па новаму, будуць высланы ў раёны брыгады газэт „Комсамольская праўда", „Чырвоная Зьмена" і „Савецкая Беларусь".

Штаб па сьвінагадоўлі пры газэтах „Комсамольская праўда" і „Чырвоная Зьмена".

Сёньня паседжаньне штабу

На 15 кастрычніка было склікана паседжаньне ўсесаюзнага штабу па сьвінагадоўлі. Меркавалася заслухаць справаздачу чатырох дырэктароў сьвінасаўгасаў і аднэй колгаснай таварнай фэрмы па пытаньнях падрыхтоўкі да сустрэчы зімы і судаклады сэкратароў комсамольскіх ячэек аб удзеле комсамолу ў організаванай сустрэчы зімы і ў барацьбе за тону-апарос.

Паседжаньне штабу было сарвана па віне НКЗБ, Колгасцэнтру, сельска-гаспадарчага сэктару Менскага ГК КСМ, газэт „Сельгасработнік Беларусі", „Колгасьнік Беларусі", ЦП саюзу ж вялагадоўчых саўгасаў, саўгасаў „Вішнёўка" і „Першага Мая", якія, ня гледзячы на неадкаротныя напамінкі не палічылі патрэбным прыслаць на паседжаньне сваіх прадстаўнікоў.

Штаб з усёй рашучасьцю патрабуе ад адміністрацыі і партыйных організацый гэтых устаноў прыняць самыя жорсткія захады да вінаватых зрыву паседжаньня штабу і забясьпечыць прысутнасьць сваіх прадстаўнікоў на паўторным паседжаньні, якое адбудзецца 22 кастрычніка, а 6 гадзіне ўвечары, у памяшканьні рэдакцыі Беларускага аддзяленьня газэты „Комсамольская Праўда" (Савецкая, 61).

Штаб.

Зьлёт юнкороў гораду Менску

20 га кастрычніка, а палове восьмай гадзіны ўвечары, у Доме Навукі і Тэхнікі адчыніўся першы зьлёт юнкороў гораду Менску. На зьлёт зьявіліся юнкоры ад розных прадпрыемстваў і ўстаноў. Сярод 118 чалавек юнкороў—6 сэкратароў комсамольскіх ячэек колектываў.

Зьлёт ад імя Менгаркому ЛКСМБ адчыніў тав. Хейман. У кароткай прамове т. Хейман зазначыў пры якіх абставінах сабраўся зьлёт і яго задачы, якія перад ім стаяць. Тав. Матвіцкі ўнёсьць прапанову аб складзе прэзыдыуму. Пад воплескі ў прэзыдыум займаюць месцы: загадчык сэктару друку ЦК КП(б)Б т. Бурцін, бюро Менгаркому ЛКСМБ, Міронаў, прадстаўнікі газэты „Чырвоная Зьмена" і прадстаўнікі ўсіх цэнтральных газэт. Парадак дня прымаецца аднагалосна. На пленарны даклад аб рэалізацыі сталінскай пуцёўкі і задачах юнкороў выступае т. Глезер.

Падрабязны матар'ял аб зьлёце будзе зьмешчаны ў наўтрашнім нумары.

Паравоз імя тав. Андрэева

Пошта-тэлеграма

ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмене"

У падарунак пленуму ЦК КП(б) організован паравоз з комсамольскімі брыгадамі: машыністыя—Котнеў, Міронаў, памочнікі машыністых—Лебедзеў, Кудраўцаў, качагары—Бараноўскі, Зелянцоў.

Комсамольскаму паравозу сэрыі Э 70817 надана імя тав. Андрэева. Першая паездка дала добрыя вынікі.

Разгарнулі падрыхтоўку да пленуму ЦК КП(б)Б

Віцебск. Віцебскі чыгуначны вузел разгарнуў вялікую падрыхтоўку да кастрычніцкага пленуму ЦК КП(б)Б.

Комсамольцы абавязаліся сваімі сіламі, прыцягнуўшы беспартыйную моладзь, адрамантаваць адзін паравоз і адзін вагон конвенцыйнага рамонту.

Да пленуму ЦК КП(б)Б усе комсамольскія паравозныя брыгады пераво зяцца на гаспадарчы разрахунак, па вопыту паравозаў сэрыі „Ш 43 і сэрыі ЭУ 44.

Канчаткова пераводзіцца на зьдзельшчыну комсамольская рацыяналізатарская брыгада і інструмантальны цэх.

Організаваны комсамольскія пасты імя „Чырвонай Зьмены" па выяўленьню прычын зрыву спаранай язды, па зьнішчэньню прастою паравозаў на вугальным складзе, па своечасоваму выхаду паравозаў пад цягнікі і г. д.

Ячэйка ТПО абавязалася ўжыць санмінімум у сталоўках, дабіцца добраякасных абедаў з наяўных продуктаў, організаваць комсамольскія брыгады ў сталоўцы дэпо, сталоўцы грузчыкаў, вагоннай майстэрні і кандуктарскай брыгадзе.

Штодзённа выходзяць насьценгазэты ў комсамольскіх ячэйках пасобных цэхаў, абточкі, прамывачнага, рамонту і ў такарным.

Да пленуму ЦК КП(б)Б перадаюцца ў рады партыі 25 лепшых комсамольцаў, разгортваецца работа па ахопу 100 проц. рабочай моладзі чыгункі комсамолам. Віцебскі вузел выклікае на соцспаборніцтва ў лепшай падрыхтоўцы да кастрычнікавага пленуму ЦК КП(б)Б Магілеўскі колектыў ЛКСМБ цягі.

Сэкратар камітэту ЛКСМБ цягі Гольдштэйн.

Камсамол па-ўдарнаму б'ецца за бульбу

Магілёў 19. Комсамольскі колектыў будвучу БЖС і ЗЧДБ уключыўся ва ўдарны месячнік ліквідацыі прарываў ва ўборцы бульбы і організацыі камсамольскіх эшалёнаў бульбы пролетарскім цэнтрам.

Колектыў абавязаўся даць 1500 працадзён на ўборку. Усе комсамольцы разам з беспартыйнай моладзьдзю абвясьцілі сябе мобілізаванымі і абавязаліся працаваць на колгасных палёх усе выхадныя дні да поўнага выкананьня пляну ўборкі і адпраўкі. Да 10 кастрычніка колектыў адпрацаваў на бульбяных палёх 170 працадзён. З 5 кастрычніка па 1-е лістапада пасылаюцца брыгады ў падшэфны сельсавет і колгасы „Парыская комуна", „Чырвоны партызан", па 15 чал. у кожную пяцідзёнку.

Беленькі.

На трасе

Прыветнае сонца раскінула свае асеньнія залатыя праменьні па баках сьвежага насыпу дарогі, яркім водбліскам грае на рыдлёўках спрытных грабароў - комсамольцаў, „сьмелым зайчыкам" залятае ў вочы моцных хлапцоў—камнябойцаў і потым зьнікае, пакідаючы вясёлыя ўсьмешкі на здаровых тварах.

Дарога, роўная, як тая струна, наладжаная кваліфікаваным маэстро музыкі, прарэзвае лясы, узгоркі, нізіны, балоты.

Сёньня гэта шырокая істужка глебы (у разрэзе падобная на трапэцыю) вабіць да сябе чалавека, які крочыць па яе паверхні-трасе.

Трас кішыць сёньня жыцьцём дзесяткаў, соцень працоўных якія па закліку комсамольцаў прышлі і прыехалі ліквідаваць прарыў на дарозе.

Рытм працы бяз жалю рэжа асеньняе пахаладзеўшае паветра:

— „Ня стой!"

— „Давай бардзюр!"

— "Націсьні, хлопцы,—пагодка выдалася.

Безьліч маладых хлапцоў і дзяўчат, пажылых дзядзькоў-колгасьнікаў — штурмуюць бездарожжа.

— Гэй вы, красуні! Чаго сабраліся ў гурт як авечкі ў дождж? Тут вам не вечарынка,—хлапцоў выглядаць некалі, працаваць трэба.

Гэта, падымаючы насілкі з каменьнем, прарасьлівым тэнорам прагучэў Грышка Сазон.

Дзяўчаты раптам схамянуліся, кінулі адна на адну па саромлівым пазірку і, разьбегшыся звонкім сьмехам, прыняліся ўкладваць па баках трасы стройнымі радамі бардзюр, праз нейкі час, пад цоканьне камецьня і звонкі лёзгат малаткоў, палілася дзявочая песьня:

Сьцелем, сьцелем
Лён кудравенькі
На сыру зямельку...

Глуха ссыпалася ў карыта трасы пабітае ў шчэбень каменьне. Плячыстыя хлопцы, трымаючы ў мускулістых руках насілкі, зьбягалі парамі на трасу пад каманду —„р-раз", высыпалі шчэбень і зноў зьбягалі да шчэбень-насыпшчыкаў. Яны не адчувалі зморанасьці.

Адведзены ім пікет для засыпкі хутка будзе закончаны, а яшчэ ўперадзе дзьве гадзіны часу.

— Давай, браткі націсьнем! Дэтэрмінова засыплем свой пікет. Пакажам што і мы „комса" ня горш раваніцкіх. Няма чаго там раваніцкім асабліва хвастацца. Возьмем і мы! .. Адгукнуўся Сёмка Васюк.

Яшчэ шпарчэй запрацавалі рыдлёўкі насыпальшчыкаў, зашурчэў шчэбень. Дзяўчаты роўнымі стужкамі клалі бардзюрны камень, зрэдку паціраючы потныя твары а хлопцы, не зважаючы на пот засыпалі апошні квадрат пікету.

* * *

Абвясьцілі абедзены перапынак.

Руплівыя брыгадзіры падводзілі вынікі працы, вымервалі засыпаныя і незасыпаныя пікеты, спрачаліся вылічвалі проценты пасьля беглі да выпускаючых штодзённае штурмоўкі, каб трапіць на чырвоную дошку.

— Падзівіська, што за якасьць працы! Так зроблена, што і ў трамбоўцы застаецца мала чаго.

— Эй брацішка што ты заціраеш? А ну-ка, палічы, хто скончыў свой пікет на гадзіну раней тэрміну? Наша комсамольская брыгада — выступіў ўперад Тодар Заводзька.

Хутка пад лік даабедзенай працы быў скончаны. Людзі на некаторы час пакінулі трас, каб адпачыць, пабедаць і з новай энэргіяй пракладаць істужку-дарогу ўсё далей і далей.

— Мужчынкі,—праказала прынізістая, у чорнай камізэльцы жанчына,—паглядзеце колькі б гэта давялосяпрацаваць адным будаўнікам дарогі. Глядзіка, які хвост мы выгналі! Але-ж спор які ў працы, калі ўсе дружна бяруцца!

— А, вось калі ты ўпэўнілася, што вялікім колектывам працаваць лягчэй і лепш выходзіць. Во калі цётка Таццяна раскачалася. Ці бачыў ты, Рыгор,—з жартам адгукнуўся мобілізаваны комсамолец.

— Ды, што гаварыць Мы зрабілі-б яшчэ больш, каб тут лепш кіравалі. А то вось—шмат людзей бяз рыдлёвак, малаткоў і іншага інструманту Каб сказалі нам ўзяць, што ў каго ёсьць—свае глядзіш усе-б працавалі. —закурваючы, прамовіў барадаты дзед Бачна любіць стары парадак на такіх суботніках, любіць добрую расстаноўку рабочых, добрае кіраўніцтва імі.

— Так, падкачалі нашыя вучастковыя і сельсавецкія начальнікі,—дадаў Саўка Ахрэмчык.

— Такая, брат, справа любіць, каб першы, чым яе распачаць,—добранька падумаць. Усе патрэбнае падрыхтаваць, што трэба наладзіць, а потым і давай.

Гутаркі абедаючых зьліваліся ў зычны гоман і поўнілі малады ельвічак, што роўнымі сьценкамі цягнуўся абапал дарогі.

Раптам:

— Таварышы! Увага!

Сёньня ў гонар комсамольскага суботніка па ліквідацыі прарыву на дарозе, аднаасобнікі організавалі колгас з 22 гаспадарак. Колгасьнікі першымі выйшлі на працу.

На гэтым нізенькі сэкратар партячэйкі, па прозьвішчу Бяроэка, спыніўся. Натоўп загудзеў мацней.

— Вітай, хлопцы! Па-нашаму зрабілі,—прагучэў хтосьці з натоўпу.

Людзі, што стаялі навокал сэкратара парт'ячэйкі, расступіліся на два бакі. Нехта праціскаўся на сярэдзіну людзкога кола. Нарэшце вышаў невялікага росту чалавек. Яго маршчыністы твар нагадваў аб вялікай колькасьці год працы.

Стары абвёў натоўп вачыма і, заікаючыся, пачаў.

— Таварышы! Дазвольце і мне. Ня вытрымала і мая старасьць.

Натоўп заціхаў.

— Я скажу вам ад імя тых, якія сёньня-ж організаваліся ў колгас. Я вам, таварышы, скажу, што мы шмат чаго перацярпелі, пакуль організавалі колгас. Наш вясковец Максім Краўчук—колькі ён разоў зрываў нам справу. Ён ішоў на ўсё—падгаварваў жанчыны супроць колгасу, зьбіраў патаемныя сходы, меў сваіх падпявал. Усё нагаварваў аб няшчасьці, якое нібіта напаткае нас у колгасе. Нават і тады, калі мы выходзілі на работу, ён бегаў па хатах, імкнуўся адгаварыць. Але спазьніўся, мы зрабілі свае.

Стары змоўк. Яго вочы гарэлі агеньчыкамі радасьці.

— Брава! малайцы маковінцы!— загуў натоўп...

Абедзены перапынак скончыўся. Людзі рушылі на трас засыпаць шчэбень, трамбаваць, пракладаць каменны памост, па якім пойдуць сотні трактароў руйнаваць старое, узьнімаць глыбу для новай, сьветлай будучыні.

П. Скокаў.

10-X-31 г.

Памылкі друку

У № 245 „Чырвонай Зьмены" ад 20 кастрычніка дапушчаны друкарскія памылкі:

1. На першай старонцы ў заяве, у апошнім абзацы надрукавана: „Бальшавіцкі друк зьяўляецца організатарам працоўных мас, аўтарам і прапагандыстам ленінскіх ідэй". Павінна быць: бальшавіцкі друк зьяўляецца колектыўным організатарам працоўных мас, агітатарам і прапагандыстым ленінскіх ідэй.

2. На трэцяй старонцы, у трэцяй калонцы надрукаваны загаловак: „Сталінская пацёўка пашла ў цэх". Павінна быць: сталінская пуцёўка пашла ў цэх.

Менгазбюро

паведамляе ўсіх падпішчыкаў „Чырвонай зьмены", што падпіска на лістапад прымаецца да 26-га кастрычніка уключна.

Пасьля азначанага тэрміну прыём падпіскі спыняецца.

Газбюро.

Нам. адказн. рэдактара С. АНІСАЎ.

З 20 кастрычніка па 5 лістапада 1931 г. будзе праводзіцца перарэгістрацыя ўсіх членаў Менскай Асоцыяцыі Пролетарскіх Пісьменьнікаў (усіх сэкцый).

Таварышы, якія ня пройдуць у гэты тэрмін перарэгістрацыі,—мэханічна выбываюць з організацыі. Перарэгістрацыя праводзіцца ў д. Пісьменьніка штодзённа ад 12 да 16 гадзіны дня.

Сэкратарыят МенАПП.

* * *

23 кастрычніка, а 7-й гадзіне ўвечары, у памяшканьні Інстытуту Гісторыі Партыі пры ЦК КП(б)Б адбудзецца нарада аўтараў па пытаньнях распрацоўкі гісторыі ЛКСМБ.

На нараду павінны зьявіцца т. т. Вэйнэровіч, Гуцін, Н. Міляўскі, Штэйман, Олікер. Ратнэр, Фрыдланд, Пішчыкаў, Кроль (комвуз), Кантаровіч (6 стр. полк).

Нам. дырэктара Інстытуту Гісторыі Партыі пры ЦК КП(б)Б Э. Канакоцін

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса, 38. Тэлефоны: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская 25, тэл. № 903. ГОД ВЫДАНЬНЯ XI.

Друкарня імя тав. Сталіна.

Упаўнаважаны Галоўлітбелу № А—2522.